**Урок асноў бяспекі жыццядзейнасці па тэме “Небяспека выкарыстання агню і піратэхнічных вырабаў пры правядзенні святочных мерапрыемстваў” (3 клас)**

**Яўгенія Міхайлаўна Савіцкая,**
настаўнік асноў бяспекі жыццядзейнасці
першай кваліфікацыйнай катэгорыі
Поразаўскай сярэдняй школы
Свіслацкага раёна

**З набліжэннем навагодніх свят важна нагадаць дзецям пра небяспекі, якія ўтойваюць у сабе ўсе піратэхнічныя сродкі. Дадзены канспект можа быць выкарыстаны на ўроку па асновах бяспекі жыццядзейнасці (праграмай прадугледжаны ўрок у канцы другой чвэрці ў раздзеле “Засцярога ад надзвычайных сітуацый. Пажарная бяспека”), на выхаваўчых гадзінах.**

**Мэта:** азнаямленне вучняў з небяспекай піратэхнічных вырабаў; замацаванне ведання правіл бяспечных паводзін у час навагодніх і калядных свят, канікул.

**Задачы:**

– развіваць здольнасць дзяцей ацэньваць небяспечныя сітуацыі, прымаць рашэнні і дзейнічаць бяспечна з улікам сваіх магчымасцей;

– навучыць прадбачыць небяспечныя сітуацыі і пазбягаць іх; выхоўваць асцярожнасць, увагу, беражлівыя адносіны да здароўя свайго і навакольных.

**Вучэбна-метадычнае забеспячэнне:** прэзентацыя, вырабы ёлачных цацак, вучэбны дапаможнік, рабочыя сшыткі, макет навагодняй ёлкі, куфэрак, “чароўная лінеечка” (графічная шкала на парце кожнага вучня для самаацэнкі альбо ацэнкі настаўніка).

## Ход урока

**І. Арганізацыйны этап**

**Настаўнік.** Добры дзень! Я бачу, што ў вас вясёлы настрой. Усміхніцеся адзін аднаму і скажыце: “Я рады цябе бачыць”. *(Дзеці абменьваюцца прывітальнымі словамі).* А я рада вас бачыць. *(Дзеці вітаюць настаўніка.)*

**Настаўнік.** Цудоўна. Пачынаем працаваць.

ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА

– Жыццё і здароўе – самае каштоўнае, што ёсць у чалавека. А каб іх захаваць, патрэбна ведаць і выконваць правілы бяспекі. Зараз праверым, як вы ўмееце прымяняць на практыцы веды, атрыманыя на мінулым уроку, тэма якога была "Самастойная эвакуацыя з дому пры пажары".

*Арганізуецца работа ў групах. Кожная група абмяркоўвае прапанаваную сітуацыю, каменціруе правільнасць дзеяння героя, калі неабходна, выпраўляе памылкі.*

**1 група.** У кватэры пачаўся пажар. Каб схавацца ад агню і дыму, Коля паўзком дабраўся да свайго пакоя і схаваўся <u>пад ложак</u>.

**2 група.** Косця пачуў моцны пах дыму на лесвіцы каля кватэры. Хлопчык выклікаў службу <u>102 і пабег да ліфта</u>, каб хутчэй выйсці з пад'езда.

**3 група**. Сярожа глядзеў тэлевізар. Раптам з'явіўся дым, і тэлевізар загарэўся. Хлопчык хутка <u>прынёс з кухні чайнік з вадой</u>, каб патушыць полымя.

*Выступаюць лідары групы, пасля ацэньваюць працу свайго калектыву.*

**II. Матывацыйна-мэтавы этап**

**Настаўнік.** Каб вызначыць тэму сённяшняга ўрока, вам патрэбна адгадаць загадкі. (*Адгадкі вывешваюцца на дошцы альбо дэманструюцца на слайдах мультымедыйнай прэзентацыі.)*

1. Галава агнём палае,
Цела ціхенька згарае.
Я карыснай быць хачу.
Няма лямпы – я свячу. *(Свечка.)*

2. У агні амаль не гарыць,
У снезе пішчыць і шыпіць.
Але ўсё роўна рабяты рады
Пачуць стрэл ад самой… *(Петарды.)*

3. У неба ўзлятаюць
Яркія агні.
Вестку аб Перамозе
Разносяць яны. *(Феерверк.)*

4. Калі лес пакрыты снягамі,
Калі пахне пірагамі,
Калі ёлка ў дом ідзе,
Што за свята яна вядзе? *(Новы год.)*

**Настаўнік.** Падумайце, чаму гэтыя загадкі мне захацелася загадаць вам менавіта на ўроку АБЖ да наступлення свята? *(Адказы навучэнцаў.)*

ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА

**Настаўнік.** Што прыносяць навагоднія святы? *(Адказы навучэнцаў: добры настрой, падарункі, канікулы, святочныя агні, розныя забавы, спаўненне жаданняў, падарункі ад Дзед Мароза і Снягуркі.)*

**Настаўнік.** Аб чым пойдзе гутарка на сённяшнім уроку? *(Адказы навучэнцаў.)*

**Настаўнік.** Сёння мы пагутарым на тэму “Небяспека выкарыстання агню і піратэхнічных вырабаў пры правядзенні святочных мерапрыемстваў”. Пра што мы даведаемся? Чаму навучымся? *(Вучні фармуліруюць задачы ўрока, настаўнік ім дапамагае)*

**III. Асноўны этап**

**Настаўнік.** Пройдзе крыху часу – і да нас прыйдуць навагоднія і калядныя святы. Каб яны былі ўсім у радасць і нішто не азмрочыла гэтыя чароўныя дні, мы пагутарым аб правілах бяспекі. (*Дэманструецца слайд з выявамі бенгальскіх агнёў, хлапушак з агнявым эфектам, свечак і інш.*).

**Настаўнік.** На экране прадстаўлены вядомыя вам прадметы. Назавіце іх. Якія з іх могуць быць небяспечнымі і чаму? *(Адказы дзяцей.)*

**Настаўнік.** Аналіз прычын навагодніх пажараў сведчыць, што часцей за ўсё яны ўзнікаюць ад бенгальскіх агнёў і хлапушак, свечак, петардаў, самаробных і няспраўных электрагірлянд. Галоўнай прычынай сапраўднай бяды з’яўляецца свавольства дзяцей з агнём.

**Настаўнік.** Дзеці, адкрыты агонь нам даюць свечкі. Успомніце, калі дарослыя іх выкарыстоўваюць. *(Няма святла, дзень нараджэння, служба ў храме.)*

– Давайце звернемся да гісторыі ўзнікнення свечкі. (*Індывідуальнае заданне вучню.)*

**Вучань.**

Упершыню свечкі з’явіліся каля 2 тысяч гадоў назад у Старажытным Рыме. Гэта былі мяккія часткі раслін, прапітаныя смалой.



У X стагоддзі з’явіліся тлушчавыя свечкі. У той час яны служылі адзінай крыніцай асвятлення.



У XV стагоддзі з’явіліся свечкі з воску, а ў XIX – з парафіну.





Парафін – гэта воск з нафты. У сённяшні час часцей за ўсё выкарыстоўваюцца свечкі з воску і парафіну.

**Настаўнік.** Ацаніце работу аднакласніка. *(Адказы дзяцей.)*

– Давайце ўспомнім з беларускай мовы, як называюцца словы, якія маюць некалькі лексічных значэнняў. *(Адказы дзяцей.)*

– Слова “свечка” таксама мае некалькі лексічных значэнняў. Зараз мы пра іх даведаемся.

*Арганізуецца работа ў парах. Дзецям прапаноўваюцца карткі з пералікам розных значэнняў слова “свечка”. На экране будзе з’яўляцца малюнак, да якога ім з пераліку неабходна знайсці адпаведны выраз.*



– У імянінніка – свечкі для торта.

ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА



– У аўтамабілістаў – свечка запальвання ў рухавіках унутранага згарання.



– У лётчыкаў – “узляцець свечкай”.



– У валейбалістаў – “падаць мячык свечкай”.

**Настаўнік.** Ацаніце работу сваёй пары.

**Настаўнік.** Дзеці, як вы думаеце, запаленая свечка тоіць у сабе небяспеку? Абгрунтуйце адказ.

*Арганізуецца работа ў парах з матэрыялам падручніка на стар. 57. Вучні чытаюць тэкст і дзеляцца адно з другім атрыманымі ведамі.*

**Настаўнік.** Чаму свечкі лічацца пажаранебяспечнымі прадметамі? (*Адкрытае полымя свечкі з’яўляецца прадметам павышанай небяспекі і патрабуе пэўнай асцярожнасці.)*

**Настаўнік.** Дзе знаходзіцца ваша пара на чароўнай лінеечцы? *(Чароўная лінеечка – графічная шкала для самаацэнкі і ацэнкі настаўнікам на парце кожнага вучня, якая ўяўляе сабой гарызантальны адрэзак, падзелены на ўзроўні: верхні, сярэдні, ніжні. З яго дапамогай навучэнец ці настаўнік адзначаюць ступень выканання задання.)*

**Настаўнік.** *(Прапануе рашыць сітуацыйную задачу.)* Вы рыхтуеце дамашняе заданне, а ў кватэры пагасла электрычнае святло. Які прадмет для асвятлення памяшкання вы возьмеце: запалкі, свечку, запальнічку, ліхтарык? Абгрунтуйце ваш выбар.

ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА

**Настаўнік.** Правільна, дзеці! Карыстайцеся ліхтарыкам, калі знікла электрычнасць і патухла святло. А пра што вы нагадалі б дарослым, якія выкарыстоўваюць свечкі падчас свят? *(Дзеці будуюць адказы з выкарыстаннем тэкста падручніка на с. 58.)*

**Настаўнік.** Перад Новым годам і Калядамі ўсе чакаюць цудаў – чым ярчэй і незвычайней, тым лепш. Многія імкнуцца ўпрыгожыць свята хлапушкамі, петардамі, феерверкамі, салютамі. Усе гэтыя атрыбуты навагодніх святаў называюцца піратэхніка. Але часцяком яны становяцца прычынай сапраўднай бяды. Чаму? *(Разважанні дзяцей.)*

**Настаўнік.** Звернемся да паходжання слова“піратэхніка” (грэч. сл.) пір – агонь, тэхне – мастацтва, гэта значыць мастацтва агню. Кожны з вас, напэўна, хоць раз бачыў феерверк, і гэта сапраўды захапляльнае відовішча, сапраўднае мастацтва агню.

**Настаўнік.** Як вы думаеце, якая краіна з’яўляецца радзімай піратэхнікі? *(Настаўнік лазернай указкай паказвае месцазнаходжанне літар у класе. Вучні вачыма сочаць за накірункам светлавога праменя, потым кожная пара забірае па адной літары і каля дошкі з іх складаюць слова “Кітай”.)*

**Настаўнік.** А цяпер праверым, ці зможаце вы сярод іншых прадметаў знайсці піратэхнічныя вырабы.

*Вучні працуюць індывідуальна, выконваюць заданне 4 на стар. 25 у рабочых сшытках. (Кружочкамі абводзяць правільны адказ.)*

**Настаўнік.** Памяняйцеся заданнем з суседам і праверце правільнасць выканання, адзначце вынік на чароўнай лінеечцы.



Цяпер агучце вынікі.

**Настаўнік.** Як вы думаеце, хто больш за ўсё атрымлівае траўм ад піратэхнікі: дзеці ці дарослыя? *(Адказы дзяцей.)*

**Настаўнік.** Так. Дзеці. Па дадзеных статыстыкі больш за ўсё траўміруюцца дзеці, асабліва 7 – 9 гадоў. Часцей за ўсё гэта адбываецца, калі яны сваволнічаюць з агнём, парушаюць правілы бяспекі. Сёння мы сфармулюем гэтыя правілы, іх выкананне дапаможа зберагчы вам здароўе і жыццё.

**Настаўнік.** Хто з вас карыстаўся петардамі? А ці ведаеце вы, з якога ўзросту дазволены продаж піратэхнікі дзецям? *(Адказы навучэнцаў, пасля чаго на слайдзе з'яўляецца правільны адказ: продаж піратэхнічных вырабаў дазволены з 15 гадоў.)*

ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ
ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА

– Значыць, калі продаж дазволены з 15 гадоў, то наша першае правіла будзе гучаць так: **НЕ набывай і не выкарыстоўвай ПЕТАРДЫ І ІНШУЮ ПІРАТЭХНІКУ!**

**Настаўнік.** Але гэта не поўны пералік правіл бяспекі. Давайце яго дапоўнім, адказваючы на мае пытанні:

1. Ці ведаеце вы, на якой адлегласці ад петарды ці феерверка павінны знаходзіцца людзі? *(20 м.)*

– Значыць, як будзе гучаць наступнае правіла?

**Бяспечная адлегласць людзей ад піратэхнікі – 20 м.**

2. Да чаго могуць прывесці ўзрывы петарды? *(Апёкі, траўмы, інваліднасць пажары)*

– Як будзе гучаць наступнае правіла?

**Не падпальвай петарды – яны вельмі небяспечныя.**

*(Можна звярнуць увагу дзяцей на тое, што нельга падымаць петарду, калі нехта яе падпальвае і кідае на зямлю, але яна не выбухае. Наступнае дзеянне прадказальна – хтосьці падымае небяспечную цацку, і яна выбухне ў яго руках. Вынік заўсёды сумны: цяжка паддаюцца лячэнню апёкі і траўмы. Ну, а калі ў руцэ выбухне ракета, то справа абарочваецца больш сур'ёзнымі наступствамі.)*

3. Ці могуць выкарыстоўвацца піратэхнічныя вырабы ў памяшканні і чаму?*(Адказы дзяцей.)*

– Наша правіла гучыць так:

– **Не прынось петарды і іншую піратэхніку дамоў, у школу.**

4. Калі ж усё-такі адбыўся пажар, то што мы робім?*(Адказы дзцей.)*

Значыць, як будзе гучаць правіла?

**Пры пажары звані 101, для атрымання медыцынскай дапамогі набірай 103.**

**Настаўнік.** Найбольш актыўнымі ў фарміраванні правіл былі…Апладысменты ім.

**Настаўнік.** У правілах дарожнага руху ёсць забараняльныя знакі. Успомніце, які выгляд яны маюць. Вы працуеце ў парах. Паглядзіце на стар. 26 рабочага сшытка. Паспрабуйце здагадацца, што забараняе той ці іншы знак. Злучыце знакі з апісаннем.

– Што ў вас атрымалася? Ацаніце работу сваёй пары пры дапамозе сігнальнай карткі.*(Зялёны – усё правільна, чырвоны – былі памылкі.)*

**IV. Падвядзенне вынікаў урока. Рэфлексія**

**Настаўнік.** Вы яшчэ больш пашырылі свае веды пра бяспеку і цяпер маеце поўнае права ўпрыгожыць нашу ёлку. *(Вучні выбіраюць цацкі і*

ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА

*вешаюць на ёлку толькі тыя, якімі можна яе ўпрыгожваць. Што нельга вешаць на ёлку, складваюць у куфэрак. Абгрунтоўваюць свой выбар.)*

**Настаўнік.** Калі ў вас застаўся добры настрой, вам ўсё спадабалася, падарыце сабе апладысменты. Калі не ўсё было да душы, то ўсміхніцеся. Дзякуй за ўрок. Мае апладысменты вам.

## Літаратура

1. Аброськіна,Т.Ю., Кузняцова, Л.Ф., Аднавол, Л.А. Асновы бяспекі жыццядзейнасці/ Т.Ю.Аброськіна, Л.Ф.Кузняцова, Л.А.Аднавол. – Мн., Адукацыя і выхаванне. 2025. – 143 с.

2. Аднавол, Л.А., Сушко, А.А. Асновы бяспекі жыццядзейнасці. 3 клас. Рабочы сшытак/ Л.А.Аднавол, А.А.Сушко.–Мн., Аверсэв. 2024. – 96 с.

NG ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА